# Шлях Моладзі



# Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

*1938 – 1939 гг.*


## Вучні запісаныя Беларусамі

Паводле статыстыкі Міністэрства Асьветы Польскай Рэспублікі у 1936-37 школьным годзе ў сярэдніх школах было запісана роўна 720 вучняў, якія падалі беларускі язык, як свой родны. З гэтага:

у казённых школах было 602 ч.
у неказённых „ „ 118 „

З агульнай лічбы 720, у Беларускай Гімназіі (філіі) у Вільні было толькі 170 чал., а рэшта – 550 чал. — вучыліся ў школах польскіх:

| | | |
|---|---|---|
| у Наваградзкім в. | (186+22*=) | 208 |
| у Віленскім „ | (104+70=) | 174 |
| у Беластоцкім „ | ( 64+22=) | 86 |
| у Валынскім „ | ( 44+ 0=) | 44 |
| у Варшаўскім „ | ( 20+ 0=) | 20 |
| у Палескім „ | ( 7+ 1=) | 8 |
| у Люблінскім „ | ( 5+ 0=) | 5 |
| у Келецкім „ | ( 0+ 2=) | 2 |
| у Лодзкім „ | ( 1+ 0=) | 1 |
| у Пазнанскім „ | ( 0+ 1=) | 1 |
| у Львоўскім „ | ( 1+ 0=) | 1** |

Гэта лічбы афіцыяльныя. З гэтай-жа статыстыкі даведваемся, што ў тым-жа часе ў чатырох ваяводзтвах — Наваградзкім, Віленскім, Беластоцкім і Палескім — усіх вучняў у сярэдніх школах польскіх было 18.108, з якіх праваслаўных — 1.578. Разам з 153 праваслаўнымі вучнямі Віл. Беларускай Гімназіі (філіі) дасьць гэта лічбу **1.731.**

Як бачым, Беларусамі не запісана нават палавіна праваслаўных, не гаворачы ўжо аб каталікох.

*) першая лічба ў дужках абазначае лік вучняў у школах казённых, а другая — у неказённых.

**) Паводле „Oświata i Wychowanie“ за 1938 год, сшыток 7-мы, бач. 658 – 669.

# Дамагаемся беларускага ліцэю!..

*Школьны год канчаецца. Моладзі і бацьком паўстаюць новыя хлопаты. Адны пераходзяць з аднае клясы ў другую, другія астаюцца ў тых самых клясах што былі, трэція канчаюць адны школы і шукаюць другіх, а колькі-ж ёсьць такіх, што хацелі-б вучыцца, хацелі-б ісьці наперад, але ня маюць дзе і за што!.. Сумныя разважаньні!.. Сумныя яны асабліва для нас беларусаў... У нас можа найбольш адчуваецца гэта нястача, нястача школаў, школаў у роднай беларускай мове і магчымасьцяў матарыяльных, без каторых у сучасных абставінах нельга здабыць навукі. Успамінаем гэтае пытаньне не дзеля пустое дэклямацыі, а дзеля таго, каб прыпомніць усім, каторыя кіруюць культурным жыцьцём, што моладзь беларуская патрабуе асьветы, роднае беларускае школы пачаткавае і сярэдняе, што моладзь гэта часта бродзіць у пацёмках і зыходзіць на блудны цёмны шлях разбою і дэмаралізацыі.*

*Тымчасам абыймо беларускае школы ўсьцяж зьмяншаецца. Рэформа сярэдняга школьніцтва абцяла і беларускай гімназіі ў Вільні старэйшыя клясы, на іх-жа месца дасюль не паўстаў ліцэй. Не дапускаем думкі, каб нагода рэформы школьніцтва ў Польскім Гаспадарстве была выкарыстана дзеля таго, каб беларусам сталася крыўда, тым больш, што быццам былі з боку школьных уладаў абяцаньні, што беларускі ліцэй агульна-навучаючы будзе адчынены. У кожным разе тое, што дагэтуль яго няма, абвявае сумам кожнага беларуса.*

*Адчуваецца так-жа вялікая патрэба адчыненьня раўналежных клясаў у беларускай віленскай гімназіі, да якое кандыдатаў прыбывае штораз больш.*

*Беларускае грамадзянства ня маючы цяпер, пасьля ліквідацыяў, сваіх беларускіх арганізацыяў, ня мае нават магчымасьці належна выявіць сваіх жаданьняў. Ня гледзячы на гэта, жаданьне сваіх беларускіх школаў як у народзе, так і ў кругох беларускае інтэлігенцыі ёсьць вялікае і яно не загіне, не заглохне!..*

*Канстытуцыя Рэчыпаспалітай гварантуе ўсім грамадзянам правы на разьвіцьцё свае культуры, а таксама і правы да школы ў роднай мове. Дзеля гэтага чуемся ў абавязку прыпомніць аб волі беларусаў грамадзян Польскага Гаспадарства.*

*РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ „ШЛЯХУ МОЛАДЗІ“.*

# Працай і верай перамажам!

(На пачатак 1938-39 акадэміцкага году).

З пачаткам кожнага школьнага году прыбывае ў універсытэцкія муры вялікая грамада новаўступаючай студэнцкай моладзі. Новыя абставіны і асяродзьдзе, новая праца і заданьні чакаюць гэты маладых нарыбак. Унівэрсытэцкія аўлі, выкладовыя залі, працоўні запаўняюцца моладзьдзю — ажываюць. У гэтай вялікай новаўступаючай грамадзе многа ёсьць і беларусаў — гадунцоў беларускай і польскіх гімназіяў. Надыходзячыя заданьні, праца зьвязаная з студыямі, ахапляе ўсю ўвагу. Выклады, сэмінарыйныя практыкаваньні, упарадкаваньне розных фармальнасьцяў — гэта першыя турботы новаўступаючага.

Але гэта толькі пачатак — першы крок маладога студэнта. Цэлае жыцьцё студэнта, яго натугі і імкненьні не агранічываюцца толькі да апанаваньня фаховае веды. Перад ім высоўваюцца так-жа і іншыя заданьні, вымагаючыя доўгай мазольнай працы: — пашырэньне свайго агульнага гарызонту, пазнаньне акружаючых зьявішчаў, праца над выпрацаваньнем сябе на запраўды дарослага грамадзка і палітычна чалавека, з акрэсьленым паглядам, з цьвёрдым пераканальнем, сьведамага сваіх абавязкаў і заданьняў перад сваім народам. Здабыцьцё агульнага разьвіцьця зьяўляецца неабходнай патрэбай, без якой немагчымая ніякая грамадзкая праца.

Беларускую моладзь, якой, паміма ўсіх перашкодаў, удалося паступіць у вышэйшую школу, чакае жорсткае, цяжкое жыцьцё і трудныя, вымагаючыя вялікіх натугаў, заданьні. Нашая моладзь — гэта сыны вёскі, эканамічнае палажэньне каторай аж надта добра ўсім ведамае. Цяжкія матарыяльныя варункі, з якімі спатыкаецца беларускі студэнт ад першых дзён сваіх студыяў, а таксама іншыя об'ектыўныя мамэнты з прычыны нашай нацыянальнасьці, робяць на яго прыгнятаючае ўражаньне. Усе гэтыя трудnasьці ставяць нашую моладзь у крытычнае палажэньне, прыводзяць часта да расчараваньня. Слабейшыя нават зыходзяць з правільнае дарогі, пачынаюць блукацца па розных крутых дарожках і сьцежачках, каб толькі знайсьці нейкі выхад з гэтай сытуацыі. Гэткі абраз мы бачылі ў мінулых гадох, такім ён зьяўляецца і сяньня.

Здавалася-б, запраўды — палажэньне беларускага студэнта зьяўляецца бязвыхадным, што ён прысуджаны на нейкую блуканіну, што ён расьцярушыцца, загіне ў масе моладзі іншых нацыянальнасьцяў.

Але гэткае дапушчэньне памылковае. У запраўднасьці нашае палажэньне не прадстаўляецца аж такім крытычным, бязвыхадным. Новауступаючая на вышэйшыя школы беларуская моладзь не зьяўляецца такой адасобленай, ня ёсьць прысуджанай на бесканечнае блуканьне ў адзіноцтве па бездарожжы. Мы маем багатую гісторыю беларускага студэнцкага жыцьця, маем свае слаўныя традыцыі, сьветлыя ідэалы. Маем свае студэнцкія арганізацыі: Беларускі Студэнцкі Саюз, Таварыства Прыяцеляў „Беларусаведы". Ёсьць-жа нас ня так ужо мала. Беларускія-ж студэнцкія арганізацыі ведамыя ўжо на міжнароднай арэне студэнцкага жыцьця. Прадстаўнікі беларускага студэнцтва бяруць удзел у міжнародных студэнцкіх зьездах, кангрэсах, знаёмячы сьвет з беларускай праблемай і пазнаючы жыцьцё іншых народаў.

Шлях беларускага студэнта ёсьць простым, бяз ніякіх заломаў. Працерабілі і вытапталі яго лепшыя сыны нашага сярмяжнага народу, змагаючы за яго лепшае заўтра; ён відны для ўсіх, у каго тліцца аганёк любові для свайго роднага краю, свайго Народу, свае нацыянальнае беларускае культуры. Што-раз большай групай, што-раз лепш сцэмэнтаванай грамадой, з моцнай верай у сэрцы ідзе па ім вернае свайму краю беларускае студэнцтва. Шляхам гэтым ёсьць праца для дабра свайго народу. На шлях гэты павінны накіроўваць свае крокі новаўступаючыя беларускія студэнты.

Ня трэба пужацца розных нявыгодаў, якія можам спаткаць на свяёй дарозе, ня трэба слухаць словаў нашых ворагаў, якія хочуць нас застрашыць, здэмаралізаваць, накіраваць у процілежны варожы для нас бок.

Вялікія заданьні, якія стаяць перад нашым студэнцтвам, вымагаюць ад яго вялікага падгатаваньня. Здабыць-жа падгатаваньне такое можна толькі пасьля доўгае і мазольнае над сабой працы, бяручы жывы удзел у сваіх беларускіх студэнцкіх арганізацыях, каторыя зьяўляюцца школай грамадзкага выпрацаваньня. На нас — студэнцкую моладзь, — як прадстаўнікоў маладой гэнэрацыі, зьвернены вочы ўсяго Беларускага Народу. Мы зьяўляемся надзеяй яго лепшае будучыні.

У аблічы сяньняшняга цяжкога палажэньня Беларусаў, мы — студэнцкая моладзь — мусім у сэрцах сваіх урачыста прырачы, што будзем годнымі контынуатарамі народна-грамадзкае беларускае працы, пачатае піонэрамі нашага адраджэнскага руху, што доўг перад народам, узложаны на нас мы выканаем. Мы, маладняк, поўныя энтузыязму і энэргіі, мусім з пачаткам школьнага году ўзяцца з удвоенай натугай за працу дзеля здабыцьця веды, асьветы і за працу дзеля палепшаньня быту нашага Беларускага Народу, павялічваючы рады беларускіх працаўнікоў.

Праца і моцная вера пераможа ўсё!...

Я. Яр—ка.

# Да справы кар'ерызму і рэнэгацтва ў бел. моладзі

У адраджэнскім руху кожнага народу, між людзьмі ахвярнымі і ідэовымі заўсёды ёсьць і кар'ерысты, а за тым і рэнэгаты. Кожны народ, бязумоўна, вядзе з гэтай злой для яго праявай барацьбу і стараецца тыя адзінкі, каторыя пайшлі нясьведама па няправільным шляху, вярнуць на правільную дарогу. Часам гэта ўдаецца, але вельмі шмат адзінак і гіне марна для свайго народу.

Гаворачы аб беларускім народзе трэба ў першую чаргу затрымацца на моладзі, каторая ў сучасны мамэнт адыгрывае бадай што дэцыдуючую ролю ў нашым адраджэнскім руху. Беларускую моладзь можна падзяліць на дзьве часткі, а іменна: тую, што астаецца на вёсцы і тую, што па большай ці меншай падгатоўцы ідзе вучыцца ў места, у сярэднія і вышэйшыя школы.

На абедзьве гэтыя часткі плыве чужая агітацыя і ўплывы, ад якіх гінуць мала загартаваныя і мала сьведамыя душы. Ня буду тут пісаць аб першай частцы, каторай шмат месца прысьвячае бел. прэса, а займуся другой часткай моладзі, іменна той, каторая маючы большую ці меншую адукацыю — веду, павінна стаяць на чале нашага адраджэньня. Нажаль, аднак, трэба праўду казаць, вельмі часта здараецца, што пэўныя адзінкі, сьведамыя нават беларусы адносяцца інэртна да ўсіх праяваў беларускага жыцьця. Здавалася-б, на першы пагляд, што аб такіх адзінках ня варта гутарыць, памятаючы, што на кожным полі знаходзяцца пустыя каласы. Аднак дзеля таго, што гэтыя пустыя каласы забіраюць шмат месца на полі і жыцьцядайных сокаў, патрэбных для здаровых расьлін, кожны добры гаспадар вядзе барацьбу з гэтай некарыснай для яго праявай.

Якая-ж на гэта рада? На мой пагляд рада зусім простая. Трэба перад усім падвоіць грамадзкую чуйнасьць і старацца пазнаваць кар'ерыстаў і апартуністаў і бяз ніякага жалю выэлімінowываць, выдзяляць іх з беларускага жыцьця пастолькі, паскольку яны знаходзячыся ў сутычнасьці з ім, запаўняюць сабой мясцы і карыстаюцца маральнай і матэрыяльнай помаччу грамадзянства. Мо хто скажа, што гэта надта срога. Аднак ня можна апякавацца і выхоўваць адзінак, каторыя цынічна і сьведама адракаюцца свайго народу і не стараюцца працаваць для ягонага дабра, ды сваеі цялячай натурай прыносяць нам сорам і ганьбу.

Ня можа быць выразумеласьці і прабачэньня для сьведамых рэнэгатаў і кар'ерыстаў у беларускай моладзі!...

Ст. Габы. *Н. Г.*

# Трагэдыя Жыдоў

Палажэньне Жыдоў ува ўсім бадай сьвеце становіцца штораз цяжэйшае. Безаглядная барацьба, якая адбывалася з Жыдамі ў Намеччыне, апошнім часам прыняла нябывалыя разьмеры.

Жару да гэтага дадаў трагічны выпадак у Парыжы. Там малады Жыд Гэршаль Грыншпан, выгнаны з Нямеччыны, прыгнечаны эміграцкай нядоляй, рашыў востра памсьціць гітлераўскія прасьледы і 7.XI.38 г., дастаўшыся ў нямецкую амбасаду, некулькімі выстраламі сьмяротна раніў сакратара гэтае амбасады фон Рата. Пасьля гэтага Немцы пачалі мсьціцца на Жыдох за сьмерць свайго прадстаўніка ў Францыі. Тэрор і напады прынялі характар масавага пагрому. У самым толькі Бэрліне спалена было 9 сынагогаў. Зьнішчожаны тысячы жыдоўскіх крамаў, прадпрыемстваў. У жыдоўскіх памешканьнях усюды павыбіваны шыбы. Памешканьні жыдоўскіх арганізацыяў паразьбіваны і ўсё ў іх зьнішчожана. Тое самае дзеялася ўва ўсіх бадай іншых местах Нямеччыны. У Вене спалена аж 20 сынагогаў. У працягу 10 дзён арыштавана і выслана ў концэнтрацыйныя лагеры 10 тысяч жыдоў. У гэтым агульным грозным мамэнце для Жыдоў паўстала вялікая паніка, з прычыны каторае, як пішуць некаторыя газэты, 400 жыдоў кончылі з сабой самагубствам. Апрача таго нямецкі ўрад налажыў на Жыдоў 1 міліярд марак кантрыбуцыі, якая будзе сьцягнена ад усіх жыдоў, што жывуць у Нямеччыне, і ўведзены цэлы рад агранічэньняў для жыдоў. Так напр. ад 1.I.39 жыд ня будзе мець права ў Нямеччыне кіраваць прадпрыемствамі гаспадарчымі. Ёсьць яшчэ шмат іншых падобных забаронаў. Пры тым немцы масава высяляюць жыдоў у Польшч.

У сьляды Нямеччыны ідзе фашыстаўская Італія. Нядаўна італьянская рада міністраў выдала дэкрэт, які моцна агранічвае правы жыдоў у Італіі. І там адбываюцца вялікія антысэміцкія выступленьні, супроць якіх востра высказаўся Папа Рымскі і каталіцкія газэты.

Палажэньне жыдоў у Палестыне таксама вельмі цяжкае. Ня гледзячы на вострую пацыфікацыю, каторую правялі там ангійцы, барацьба між арабамі і жыдамі ня сьціхае. У працягу апошніх 4-х месяцаў у Палестыне было забітых 1359 асоб. Перамога перахіляецца на старану Арабаў, бо Англія ўжо выракаецца пляну падзелу Палестыны на дзьве часьці: жыдоўскую і арабскую, супроць якога востра выступалі арабы, і стараюцца сарганізаваць супольную арабска-жыдоўскую канфэрэнцыю, з мэтаю пагадзіць гэтыя два народы і наладзіць супольнае сужыцьцё. Арабы аднак і на канфэрэнцыю ня хочуць ісьці, пакуль ня будзе стрыманы наплыў жыдоў у Палестыну.

Палажэньне Жыдоў у Палестыне, Італіі, а перад усім у Нямеччыне прымусіла заняцца жыдоўскім пытаньнем Злуч. Штаты Паўночнай Амэрыкі, якія выступілі ў абароне Жыдоў, а таксама іншыя гасударствы, як Англію, Голяндыю, Бэльгію. Гэтыя гаспадарствы ў першую чаргу шукаюць абшараў, дзе можна было-б пасяляць жыдоўскіх эмігрантаў, якія ўсьцяж ідуць з Нямеччыны і Італіі. Свабодных аднак абшараў ёсьць вельмі мала, а можна нават сказаць, што зусім няма. Дзеля таго жыдоўская праблема далей знаходзіцца ў тупіку, у які загналі яго фашысты і гітлераўцы, пачынаючы нездаровую расавую барацьбу.

*Я—к.*

## *Цяжкі лёс беларускага школьніцтва*

*Справа беларускага школьніцтва ў Польскім Гаспадарстве ніяк ня можа выйсьці з сьляпога завулка, у якім апынулася бадай ад самага пачатку існаваньня адроджанае Рэчыпаспалітай. Пры тым найбалючэйшым ёсьць тое, што ня відаць палепшаньня. Наадварот, як прыйдзе вясна — канец школьнага году,— дык зьяўляемся сьведкамі розных зьменаў, каторыя астаўляюць па сабе толькі сумныя сьляды. Фактам ёсьць, што лік школаў пачатковых, у якіх была „браная пад увагу беларуская мова,“ ўсьцяж зьмяншаецца. Фактам так-жа ёсьць, што з 7-мі беларускіх гімназіяў асталася толькі адна віленская, каторая зьяўляецца ужо толькі філіяй польскае гімназіі ім. Славацкага, заціснутай у цёмныя і цесныя куткі. Ня глядзячы на гэта Віленская Беларуская Гімназія прыцягвае да сябе кандыдатаў з усіх бакоў. Адчуваецца вялікая нястача месца. У адну толькі першую клясу ў мінулым годзе было больш 80 кандыдатаў, тады як месца ёсьць толькі для 40 і гэтулькі ўсяго было прынята, а рэшта мусіла астацца дома — ў цесный вёсцы...*

*Гэта ўсё гаворыць, што Беларуская Гімназія павінна атрымаць большае памешканьне, права на адчыненьне раўналежных клясаў і ясна павінна атрымаць урэшце адабраныя ёй правы адзельнае незалежнае школы. Гэтага вымагаюць ня толькі патрэбы характару чыста асьветна-школьнага, але таксама справа сужыцьця народаў—польскага і беларускага.*

*Што чакае Віленскую Беларускую Гімназію з боку школьных уладаў, нам ня ведама. Хочам аднак пры гэтым сьцьвердзіць факт, што ў „Dzienniku Urzędowym Kuratorium Okręgu Szkolnego Wileńskiego“, № 6—7 з дня 1.VI. 1938, у афіцыяльным урадавым аддзеле: „Арганізацыя школаў“ (бач. 205), у сьпісе віленскіх гімназіяў на 1938—39 г., Беларускае Гімназіі чамусьці няма. Няма так-жа гімназіяў польскіх ім. Ю. Славацкага і ім. Ад. Міцкевіча, якія месьцяцца разам у тым-жа самым будынку, што і гімназія беларуская. Не падана, праўда, так-жа, якая гімназія ў Вільні будзе першая, а ёсьць толькі нумары гімназіяў: II, III і IV. Знача лёс гімназіяў: беларускай, ім. Ю. Славацкага, ім. Ад. Міцкевіча яшчэ ня вырашаны і мусіць тут будуць нейкія рэформы...*

*Беларусы, якім усе дагэтуляшнія рэформы выходзілі на некарысьць, на гэты раз хіба-ж не патрабуюць спадзявацца чагось ня добрага для апошняе беларускае сярэдняе школы... Карыстаючы аднак з часу і ведаючы ўжо з зваротаў з вёскі да „Шляху Моладзі“ па інфармацыі ў справе бел. гімназіі, што наплыў кандыдатаў да гэтае школы і сёлета будзе вялікі, прыпамінаем аб патрэбе расшырэньня адзінае беларускае сярэдняе школы, каторая ня можа заспакоіць нават мінімальных патрэбаў беларускага насельніцтва.*

*Адначасна зьвяртаемся да ўсіх польскіх дзеячоў, якім справа асьветы, а таксама справа сужыцьця народаў нашага краю ёсьць блізкай, зьвярнуць увагу на патрэбу для беларусаў школаў у іх роднай мове, як пачатковых, так і сярэдніх, каторых Народ Беларускі жадае і гэтыя жаданьні належна падтрымаць прад дэцыдуючымі ўладамі.*

**Я. Н.**

## *Моладзі*

*Гэй, моладасьць — парыў!*
*Пакуль кроў гарача,*
*Да сонца, да зары*
*Сьпяшай, хто ня стары,*
*Бо сонца шлях нам знача.*

*Няхай злуе віхор,*
*Няхай скавыча нема*
*Да сонца на прастор*
*Сьпяшай на сход на збор —*
*Мы там сьвятло сустрэнем.*

*Хай ногі ломяць брук,*
*Зямля хай стогня нема.*
*Гэй, не шкадуйця рук,*
*Да сонца, да навук!*
*Насустрач пойдзем сьмела!*

*П. Граніт.*

### Культурная праца замерла.

*Дзятлава, Навагрудзкі пав.*

Культурная беларуская праца ў нашай ваколіцы, нажаль, замёрла, не дзеля таго, што няма каму яе праводзіць, а дзеля таго, што настаў няспрыяючы час. З арганізацыяў найбольш пашырана ў нас „Млода Польска“, каторая ўсялякімі спосабамі стараецца прыцягваць да сябе сяброў і заклікае людзей да проціўжыдоўскага настаўленьня. Але ўплывы гэтае арганізацыі слабыя.

Жыцьцё сялян шэрае, беспрасьветнае, як шэрыя і абросшыя мохам іхнія ўпаўшыя ў зямлю будынкі. Палажэньне матарыяльнае цяжкае, прытым адчуваецца вялікі недастатак апалу—дроў.

Ня гледзячы на цяжкае палажэньне, дух беларускі ў народзе не замірае і ўсе стойка трымаюцца свайго, верачы, што жыцьцё паправіцца.

*Н. Жальба.*

### Косаўшчына будзіцца.

У нас доўгі час па ліквідацыі гурткоў Т.Б.Ш., беларускіх бібліятэкаў, беларуская культурная праца была на нейкі час прыціхла. На вёсках было натварылася бяз ліку розных польскіх „кулак“, але яны нічога тут карыснага для вёскі ці моладзі не зрабілі, і ўжо ў апошнія гады яны ўсюды прыціхлі. Сягоньня моладзь Косаўшчыны пачала будзіцца, у многіх вёсках моладзь стала выпісваць „Шлях Моладзі“ і цікавіцца беларускай справай. Некаторыя вёскі Косаўшчыны стаяць на даволі высокім культурным узроўні: моладзь у іх ня п'е гарэлкі, ня іграе ў карты, на вечарыне захоўваецца паважна і г. д., але ёсьць на жаль і вёскі адсталыя, якія, думаю, аглядзяцца і ўзыйдуць на добры шлях.

**Я. Ч.**

## *Полацак*

*Над рэчанькаю Палотай*
*Стары Полацак стаіць*
*І задумана — з дрымотай*
*Ў люстра рэчачкі глядзіць.*

*Ўспамінае з старым ладам*
*Ў даўнасьць збегшыя часы,*
*Калі быў ён стольным градам*
*Маладой Беларусі.*

*Меў харомы і сьвятліцы,*
*Жыў у ім Вялікі Князь,*
*І гасьцей з-паза граніцы*
*Ён прыймаў не адзін раз.*

*У трывожныя хвіліны*
*Пралятаў кліч баявы:*
*Сабіраліся дружыны*
*І гудзеў звон вечавы.*

*Правёў жыцьцё маладое*
*Ў ім друкар наш Скарына.—*
*Ўспамінай сваё былое,*
*Беларуска Старана!*

1938. *А. ЖУК.*

# Хочам вучыцца пабеларуску

## Як і з чаго здабываць беларускую асьвету

„Па ўсей Рэчыпаспалітай моладзь пайшла ў школы здабываць сьвятло і навуку. Польская, жыдоўская, нямецкая моладзь пайшла ў свае родныя школы, а мы беларусы йдзём найчасьцей у школы, дзе вучаць папольску. Але мы хочам вучыцца пабеларуску. Мы нездаволіваемся тым толькі, што нас вучаць у школе, хочам пазнаць і беларускую грамату і свой край і сваю беларускую гісторыю і літаратуру. Моладзь школьная і пазашкольная просіць Паважаную Рэдакцыю „Шляху Моладзі“ парадзіць, як найлепш праводзіць самаадукацыю. Якія былі-б найлепшыя падручнікі: 1 дзеля першае навукі чытаньня і пісаньня пабеларуску, 2. дзеля далейшага разьвіцьця чытаньня і пісаньня, 3. дзе можна знайсьці весткі аб гісторыі і геаграфіі Беларусі.“

*Навасельская моладзь*
Нісьціžаўская воласьць,
Ваўкавыскі пав.

Гэткае пісьмо атрымала рэд. „Шляху Моладзі“ 25.X.38 ад Беларускае моладзі з Ваўкавыскага пав. Такія і падобныя пісьмы прыходзяць із іншых куткоў нашага Краю, бо туга, імкненьне да сьвятла, да навукі ў роднай беларускай мове сярод моладзі ёсьць вялікае. Пастараемся тады ўсім адказаць.

Вось-жа самаадукацыю найлепш праводзіць групамі. — Трэба сабірацца па некалькі асоб (ня болей 9). Чытаць кніжкі, расказваць іх адзін другому, абгаворваць рэчы незразумелыя, а ў разе патрэбы вырашаць іх пры помачы людзей граматных. Пісаць дыхтоўкі, спраўджаць — пытаць — веду з таго, што ўжо было разглядана, вывучывана і чытаць як найбольш кніжак, каторыя найлягчэй такжа купляць супольна. Добра было-б тварыць супольныя прыватныя бібліятэкі. Выпісваць свае часапісы, у якіх можна многа знайсьці ня толькі цікавых вестак, але і цэнных павучаючых артыкулаў. Першымі і найлепшымі падручнікамі дзеля навукі чытаньня і пісаньня пабеларуску будуць:

1. **Першыя Зерняткі** — С. Паўловіча,
2. **Пішы самадзейна** — С. Паўловіча.

Каб навучыцца правільна пісаць і гаварыць пабеларуску, трэба пазнаць добра:

1. **Беларускую граматыку**— Бр. Тарашкевіча,
2. **Беларускі правапіс** — Р. Астроўскага.

Каб мець хоць малое паняцьце аб беларускай літаратуры, трэба пазнаць:

1. **Гісторыю беларускае літаратуры** — М. Гарэцкага,
2. **Хрыстаматыю старое беларускае літаратуры** — таго-ж М. Гарэцкага і
3. **Хрыстаматыю беларускае літаратуры** ад 1905 г. — І. Дварчаніна.

Апрача таго трэба прачытаць прынамсі такія кніжкі:

1. **»Шляхам жыцьця«** — Я. Купалы,
2. **»Новую Зямлю«**— Я. Коласа,
3. **»Сымона Музыку«** — Я Коласа,
4. **«Вянок«**— М. Багдановіча,
5. **«У Палескай глушы»** і
6. **«У глыбі Палесься»** — Тараса Гушчы і іншыя творы маладзейшых беларускіх пісьменьнікаў і паэтаў: Машары, Танка, Арсеньневай, Ільляшэвіча, В. Адважнага.

Паняцьце аб геаграфіі і гісторыі Беларусі можна здабыць з наступных кніжак:

1. **Геаграфія Беларусі** — А. Смоліч.
2. **Кароткі нарыс гісторыі Беларусі** — праф. Ул. Ігнатоўскага,
3. **Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня** — Ад. Станкевіча.

Сялянскай беларускай моладзі радзім так-жа зацікавіцца такімі кніжкамі:

1. **„Ziemlarobskaja čytanka“** —інж. Ад. Клімовіча,
2. **«Zło i lakarstva na jaho»**— інж. Ад. Клімовіча,
3. **«Пчолы»** — Я. Пачопкі,
4. **«Садоўніцкая чытанка»**— кніжка гэта яшчэ ў друку, але за месяц выйдзе і будзе ўжо ўпрадажы.

Усе вышэй пералічаныя падручнікі і кніжкі можна выпісаць з Беларускае кнігарні „Пагоня“— Wilno, Завальная вул. № 1.



### Пашыраецца сэктанства

**Дзятлава, Наваградзкага павету.** Сяляне нашае і суседніх валасьцяў ня раз дамагаліся беларускіх школаў для свае моладзі, аднак іх дасюль няма. Вучыцялі далей вучаць толькі папольску. Апрача таго нават і праваслаўнае духавенства пачало навучаць рэлігію дзяцей папольску, ды ўвяло па школах, як абавязкавыя, падручнікі Закону Божага ў польскай мове, якое з нашых вясковых беларускіх жыхароў ніхто добра ня знае. Усё гэта зьбівае, як кажуць, з толку селяніна, а ў выніку—пашыраюцца розныя сэкты. Чаму гэтага не бяруць пад увагу духоўныя ўлады?

**Сьлёзнавокі**

# Шануйма народныя скарбы!

*Гэй, родныя песьні! Вы ў суме і горы,*
*Ці ночка пануе, ці сівер дзьме зімны,*
*Для роднай зямелькі вы сьветлыя зоры,*
*Для роднага краю вы райскія гімны.*

*У вас адаб‘ецца нядоля і доля,*
*Уздыханьні, што ходзяць з сахой і з сякерай,*
*І холад і голад, няволя і воля,*
*І ў будучнасьць ясну надзея і вера.*

*Я. Купала*

# Пяе беларускі маладняк

Ніжэй друкуем кароткія інфармацыйныя зацемкі С. Хмары аб маладых беларускіх паэтах—вяскоўцах, якія паходзяць пераважна з паўдзённае часткі нашага краю. Зацемкі С. Х. далёка не абхопліваюць усіх нашых пачынаючых паэтаў. Дзеля таго іншым разам будзем старацца падаць весткі і аб іншых; у сувязі з гэтым усіх маладых бел. паэтаў просім прысылаць нам свае жыцьцяпісы. — **Рэдакцыя.**

Пяе беларускі маладняк! Ці то ў полі за сярпом, ці то на дарозе з лапатаю. Ці галодны, ці наеўшыся. Ці ў радасьці, ці ў горы, — у бядзе беспрасьветнай выліваецца душа беларуса песьняю. Пяе на вясельлі пад бубен вясёлы і пяе за кратамі...

Пяе беларускі маладняк! Па ўсіх кутках беларускай зямлі грыміць бураю, плача балотнаю кнігаўкаю песьня. Родзіцца яна пад кашуляю зрэбнаю аратага за плугам, пад пастушаю сярмягаю на выгане. Бо шмат у Беларусаў паэтаў, шмат песьняроў.

Ідуць песьні, вершы із вуснаў у вусны, із вёскі ў вёскі, з аколіцы ў аколіцу і становяцца народнаю ўласнасьцю.

Ніхто ня знае імя паэта, —
бо імя ягонае: Народ.

Некаторыя мільгануць на бачынах беларускіх часапісаў і зноў заміраюць зацінутыя ў абцугі нядолі, шэрага, беспрасьветнага нідзеньня. — Другія — сілком адарваныя ад роднае старонкі і творства на роднай ніве...

Многа ў Беларусаў песьняроў, паэтаў сялянскіх. Многа талентаўсамародкаў. Не адзін у іншых варунках стаўся-б славаю свайго краю. Сёньня-ж — марнеюць і гінуць. Аб гэтых песьнярох сялянскіх будзе мой рэпартаж.

### Н. Жальба

У Наваградзкім павеце, у адной із вёсак радзіўся пясьняр. На маленькай гаспадарцы расло 4 братоў. Душу паэта залівае жаль, ён апявае сялянскую бяду, жудасныя галодныя будні.

Жальба — сялянская, шэрая, цяжкая жальба.

Быў часова і за кратамі.

Брат памёр ад кулі абшарніка падчас страйку. Сам, каб неяк жыць, пайшоў у прыймы і муза прыціхае.

Друкавацца пачаў у „Крыніцы", „Шляху Моладзі" і інш. Зборніка ня мае, бо няма выдаўца.

Ня гледзячы на жахлівыя абставіны жыцьця, у творах зьвініць бадзёрасьць.

### Анатоль Івэрс

Мастацка апрацаваныя мініятуркі-вершы, — проста ня верыцца, што выйшлі з пад сялянскай рукі.

Івэрс. Пахне штось расейскімі сымбалістамі. Чуваць начытанасьць, культура. Сялянскі інтэлігент. Малады. 25 гадоў. Родам з в. Чамяры ў Слонімшчыне. Вучыўся калісь у беларускай гімназіі. Пасьля этапы і йзноў вёска. Піша і друкуецца з 1932 г. у „Літ. старонцы", „Летапісе" „ШляхуМоладзі", „Калосьсі". Зборніка йшчэ ня мае.

Вершы зьвіняць стальлю змаганьня за лепшую долю.

### П. Зьвястун

З сялянскай сям'і з Косаўшчыны. Пачаў пісаць у 25-ці гадох. Друкуецца вельмі рэдка ў бел. часапісах, як „Родныя Гоні", „Летапіс", бо большую частку свайго жыцьця адбывае за мурамі.

Прыймаў удзел у спробе стварыць бел літаратурную групу „Веснаход" у 1928 г., а пасьля ў „Літ. Старонцы". Шмат твораў згінула. Зборніка ня мае.

### М. Ліст

„. .Ціха дзед! —
Не нэрвуйся!
Сэрца ўнука — моцны гарт.
Сьлёзы выціраць вазьмуся —
Я
І многа нас.

Пяе ён Беларускаму Народу і сіняму Нёману, над якім у Лідчыне жыве. Але жыцьцё не вясёлае і спутвае рукі не аднаму. Замоўк апошнім часам Ліст.

Друкаваўся ў „Шляху Моладзі" і інш. час. Зборніка ня мае.

### А. Рэдзька

Вельмі плодны малады пясьняр з Віленшчыны. Пачаў друкавацца ў „Бел. Газэце". Пасьля быў у вастрозе. Цяпер дома на вёсцы. Аб сабе гавора:

Мы — скрыўджаных няпраўдай —
струны.

### Прамень

Малады паэт з Зачэпічаў. Лідзкага павету. З гэтай-жа вёскі паходзіць Граніт і Струмень,

# З рэлігійнага фронту

*Хто згадзіўся разбураць цэрквы?*

У № 16 „Шляху Моладзі" з 25.VII.1938 г. мы пісалі, што:„Аднэй з найбольш важных справаў у Украінцаў зьяўляецца цяпер абарона правоў праваслаўнае веры украінскага насельніцтва, сярод якога апошнім часам у Рэчыпаспалітай праводзіцца энэргічная акцыя наварочваньня на каталіцтва рымска-лацінскага абраду. Пры тым здараюцца частыя выпадкі падпалу праваслаўных цэркваў." Пасьля падобны выпадак здарыўся ўжо і ў нашай старонцы, а іменна ў Маладэчне, дзе хтось дагэтуль нявыкрыты ўзарваў праваслаўную царкву. У гэтых справах забіралі ўжо галасы ў форме пастырскіх лістоў праваслаўныя епіскапы і грэка-каталіцкі украінскі Мітрапаліт А. Шэптыцкі ў Львове, але пастырскія пісьмы іх былі сканфіскаваныя.

Аб усім-жа гэтым вясковы орган ОЗН-у„Wieś Polska," у №16 з 4.IX.38, даслоўна гэтак піша:

„Апошнім часам нашыя ўлады сканфіскавалі пастырскае пасланьне праваслаўнага сабору, а так-жа пастырскае пасланьне мітрапаліта Шэптыцкага. Пастырскія лісты праваслаўных біс-

не мітрапаліта Шэптыцкага. Пастырскія лісты праваслаўных біс-
купаў і мітрапаліта Шэптыцкага былі ў сувязі з распараджэньнем адміністрацыйных уладаў, каторыя, пасьля паразумленьня з адпаведнымі праваслаўнымі дзейнікамі, прыказалі на абшары некалькіх паветаў люблінскага ваяводзтва разабраць 90 цэркваў, 10 капліцаў і 27 дамоў малітвы."

Усё тут больш-менш ясна. Ня ясна толькі, якія праваслаўныя дзейнікі згадзіліся на разборку цэркваў тады, калі праваслаўныя епіскапы выступілі супроць гэтага?... Добра было-б, каб „Wieś Polska" і гэта высьніла.

*З. Б.*

Быў час, што задумалі яны выдаць свой зборнік. Да супалкі прынялі Ліста, сабралі грошаў... Аж тут бах! Паўстала пытаньне: што за часапіс, што за рэдактары?.. І кончылася ўся імпрэза...

Прамень пачаў друкавацца ў „Нашай Волі“.

### Пятрусь Граніт

Малады селянін з не малым талентам. Патрабуе, як і ўсе бадай пачынаючыя вясковыя паэты, шліфоўкі. Піша многа вершам, прабуе пісаць і прозай. Друкуецца ў „Шляху Моладзі“, календарох і інш. часапісах. Робіць поступ і, ня гледзячы на цяжкае жыцьцё, разьвіваецца.

### Малады Дубок

Малады хлапец, сын селяніна са Слонімшчыны. Вельмі плодны. З вершаў яго б'е нейкі сум і туга. Няма радасьці, хоць час-адчасу вырываюцца і бунтарныя радкі. Піша. Піша ўсюды. Дзень і ноч. Напісаныя-ж творы трымае за пазухай, бо ў хаце спаляць. Шмат ужо спалілі. Бо-ж маці чула, што за паперкі нейкія людзей бяруць... А тут у яе сына столькі пісаных паперак!..

Друкаваўся ў „Шляху Моладзі“, календарох ад 1930 г. На зборнік няма выдаўцоў.

### Я. Крыга

Характарызуецца багацтвам абразоў і думак. Шмат абяцаючы талент. Патрэбна толькі шліфоўка.

Наш другі Бялуля. Бо Я. Крыга — жыд зрадніўшыся з беларускаю сярмяжнаю вёскай. Кравец у малым мястэчку Слонімшчыны. Вучыўся пару год у беларускай гімназіі.

Друкаваўся ў „Шляху Моладзі“ і інш. Цяжкія жыцьцёвыя абставіны не даюць паэту шырака займацца літаратурай.

### М. Засім

Паляшук. Паходзіць з Пружаншчыны. Друкуецца ў „Шляху Моладзі“, „Летапісе“ і інш. часапісах. Лірык і сатырык. Падпісваўся калісь: Міколка-Круцёлка. Цяжкая доля не дазваляе шырэй займацца літаратурай. Аб зборніку цяжка думаць.

### Аб сабе

Першы раз у друку ў 1925 г. Рэдакцыя „Крыніцы“ папутала мяне з Жальбай і мой першы верш быў надрукаваны пад яго-ным псэўданімам. Друкуюся рэдка. „Крыніца“, „Сял. Ніва“, „Наш Голас“, „Шлях Моладзі“, „Летапіс“, „Калосьсе“ і інш. Прычына: вечныя вандроўкі па этапах.

У 1929 г. браў удзел у спробе сарганізаваньня літ. групы „Веснаход“. У 30 г. гіне першы томік вершаў прыгатаваны да друку п. н. „Бунтарнае“, разам з ліквідацыяй Выд. Т-ва „Рунь“. У 36 годзе прыгатаваў новы зборнік вершаў да друку, але абставіны так склаліся, што толькі нядаўна вярнуўся да хаты. Прыгатаваны да друку зборнік ляжыць, а я шукаю выдаўцоў. — Ці знайду?

—o—

Але ня будзем бедаваць!..

Браты! Бліжэй да кніжкі. Часьцей заходзьма ў кнігарні! На бок карчма! Далоў усе перашкоды! Бліжэй брат да брата і да свае роднае беларускае кнігі!.. Тады будуць выдаўцы. Тады песьня наша яшчэ мацней загрыміць, весялей будзе на душы і лягчэй долю горкую знасіць, — да сьвятла ідучы!...

*Сяргей Хмара.*

Казлоўшчына.

## Ноч

*Зьмяркканьня шэраю дзяругай*
*пакрыты сонныя палі*
*і толькі вёска чорнай смугай*
*як-бы маячыцца ў далі...*

*Панура й сумна, быў пустыні,—*
*кругом пануе ціхі змрок...*
*як пад заклятаю сьвятыняй,*
*павіс над Краем злы урок...*

*І толькі зоркі з зімнай ласкай*
*шапочуць нештачка ральлі...*
*О, ноч! калі-ж ты кончыш казку*
*людзкой нядолі на зямлі?*

*АЛЕСЬ МІЛЮЦЬ*

* * *

*Ня злуйся, Нёман серабрысты*
*і не хляшчыся ў берагі —*
*ў тваім хвалюючым потоку*
*абмыем мы усе грахі...*

*І зоры вылавім з пад неба,*
*рассыплем сонца па зямлі*
*і закрасуюць зноў палоскі*
*сялянскай беднае ральлі.*

*Свой лёс мы моладзь*
*ў рукі возьмем*
*юргіняй пышна ўквецім шлях —*
*жыцьцё мы новае народзім*
*і доля шчасьцю дасьць размах.*

*Янка Каліна*

### Трэба вярнуцца да добрых звычаяў

**Гароднікі каля Квасоўкі, Горадзенскага павету.** Пару год таму назад быў у нас уведзены ў жыцьцё вельмі прыгожы звычай рабіць пастанову ня піць гарэлкі, а калі хто не падпарадкаваўся гэтай пастанове, таму ўсе аб'яўлялі сяброўскі байкот. Цяпер, ня гледзячы на тое, што нацыянальная сьведамасьць беларуская вельмі ўзрасла заўважваецца паварот да п'янства, каторае руйнуе нас. Вось-жа прыгожы і ўводжаны ўжо звычай байкоту п'яніцаў трэба абавязкава аднавіць і ўсюды неадкладна яго ўводзіць на нова, асабліва ў жыцьцё моладзі. Тыя-ж грошы, што ішлі на гарэлку, няхай ідуць на кніжкі і газэты беларускія, каторыя дадуць нам разрыўку і цэнныя ды цікавыя весткі і артыкулы.

М. Г—іч.

### Калі-ж будуць беларускія аўдыцыі?

*Баранавічы.* Радыё-апараты, як у Баранавічах так і ў акалічных вёсках даволі шырака распаўсюджаны. Да гэтае пары найчасьцей аднак слухалі ў нас Менск, бо гэта была найбліжэйшая радыё-станцыя і адтуль давалі аўдыцыі (перадачы) пабеларуску— зразумелыя для нашага народу. Ясна, такое зьявішча спатыкалася з супраціўленьнем паліцыі, бо Менская радыё-станцыя пашырала камуністычныя ўплывы. Дзеля барацьбы з ёю выбудавалі радыё-станцыю ў Баранавічах і яна ўжо працуе, але, нажаль, беларускіх аўдыцыяў не дае, хоць усе іх цэлым сэрцам жадаюць. Дзіўна сапраўды, што баранавіцкая радыё-станцыя абсалютна ня дбае аб патрэбах мясцовага беларускага насельніцтва, тымбольш, што калі яна будавалася, дык нават польскія газэты шырока пісалі, што баранавіцкая радыё-станцыя павінна змагацца з камуністычнай радыёвай прапагандай і карыстацца беларускай мовай. Калі-ж тады будуць беларускія аўдыцыі?

*Б. радыёабонэнт.*




### Някультурнасьць на вёсцы

*в. Задубеньне, Крывіцкае вол., Вялейскага пав.* Някультурнасьць на вёсцы прыймае пагражаючыя разьмеры. Бойкі і „гульні“ з нажамі павялічваюцца, бо беларускія бібліятэкі-чытальні, якія нясьлі сьвятло пад сялянскую страху, разам з беларускімі арганізацыямі, пазакрываны. На іх месца нічога яшчэ ня створана, а польскія арганізацыі беларускіх не заменяюць, бо ўсё вядуць папольску, незразумела для бел. сялян. Школа на вёсцы бяз роднае мовы таксама ня можа прычыніцца да замацаваньня граматнасьці. Каб ня быць галаслоўным, падаю факты. Сёлета было абвешчана, што ня будуць прыймаць у Латвію на сэзонныя работы няграматных, дык усе хлопцы з в. Задубеньне, каторыя думалі ехаць у Латвію, аказаліся няграматныя, хоць кожны з іх адседзіў сем гадкоў у пач. польскай школе, і былі змушаны хадзіць на вячэрнія курсы, каб навучыцца расьпісацца і гэтым дабіцца выезду ў Латвію. — Ясна, што для нашага народу патрэбная школа родная—беларуская. І сяляне в. Каранішачы і Задубеньне ў 1936 г. падалі дэклярацыі Школьнаму Інспэктару Вялейскага пав. на адкрыцьцё ў Задубеньні беларускае школы, але далей існуе тут толькі польская школа. Бедната сялян стаіць пры тым на перашкодзе пашыраньню друкаванага слова. Адчуваецца голад кніжак, асабліва дзеля пашырэньня пачаткавае асьветы. Бязумоўна трэба ўсе перашкоды перамагаць і будзіць моладзь да культурнага жыцьця. Калі будзем баяцца перашкодаў, то і далей будзем нешчасьліўцамі. Хто пераможа цемнату, той уцешаны будзе пазьнейшаю памыснасьцю.

Дык вось, браты! Кіньмо бойкі і п'янства і хутчэй за асьвету! Замест нажа і другіх прыладаў да бойкі, купляймо супольна кніжкі і газэты. Пакажэма, што мы, як і ўсе культурныя людзі, хочам жыць палюдзку, культурна.

*Кастусь.*

### Солтысы не аддаюць беларускіх часапісаў.

*в. Пелеўцы,* пав. Шчучынскі. У нашай вёсцы ёсьць многа нараканьня, што не даходзяць «Шл. Моладзі“ і іншыя часапісы, якія мы выпісваем. Аказваецца, што не дапушчае іх солтыс В. М. Гэткія выпадкі здараюцца і ў іншых вёсках. Дзеля гэтага аднак ня трэба падаць духам, а трэба самым ісьці на пошту і там дамагацца сваіх часапісаў. Урэшце трэба аб такіх паступках усім памятаваць і гэтым шкоднікамі як будзе адпаведны мамэнт, адплаціцца. Напр., як прыйдуць новыя выбары, ня выбіраць іх далей на солтысаў і агулам выключаць з грамадзкага жыцьця.

А. Шын—віч.

*АД РЭДАКЦЫІ:* Усіх Паважаных Падпішчыкаў, дзе здараюцца такія паступкі солтысаў, што яны забіраюць не належны ім наш часапіс „Шлях Моладзі,“ ды не аддаюць яго падпішчыкам, просім зараз паведаміць нашую рэдакцыю, падаючы іх прозьвішчы і адрысы. Мы-ж такіх паноў будзем цягнуць да судовае адказнасьці, дамагаючыся ня толькі пакараньня, але і матарыяльнага адшкадаваньня.

### Сьвяшчэньнік паступае нязгодна з абавязуючым правам.

*Астрына, Шчучынскі пав.* Ня так даўно адбылася ў нас зьмена настаяцеляў. Новы наш сьвяшчэннік быццам беларус і ўсе прыхаджаньне таксама беларусы. Аднак сьвяшчэньнік чамусьці пачаў вучыць у школе рэлігіі папольску і пробаваў нават гаварыць у царкве папольску казаньні. Калі сяляне запыталіся яго, чаму ён гэтак робіць, дык ён сказаў, што так рабіць сказалі яму ўлады. Але мы гэтаму ня верым. Бо вось нават у школьным падручніку: „Z naszej teraźniejszości“ чытаем, што ў Польшчы ёсьць толеранцыя, што ўсе грамадзяне розных нацыянальнасьцяў роўныя, ды што могуць вызнаваць тую рэлігію, якую хочуць і карыстацца ў малітве сваей роднай мовай, ніякага-ж прымусу ня можа быць і няма і г. д. І гэтыя правы забясьпечвае нам Польская Канстытуцыя! Дык няма чаго крывіць душой! Мы праваслаўныя беларусы хочам маліцца пабеларуску і хочам, каб нас нашай праваслаўнай рэлігіі вучылі сьвяшчэньнікі пабеларуску. І сьвяшчэньнік у такіх выпадках павінен паступаць згодна з воляй народу і з абавязуючым правам.

*Г. В—кевіч.*

### Чэсьць маладым культурнікам

*в. Асташын, Наваградзкага пав.* Вёска Асташын здаўна славіцца культурнымі поступамі. Моладзь тут у большасьці сьведамая. Ёсьць, праўда, крыху здраднікаў, рэнэгатаў (вырадкаў), юдаў, п'яніцаў і зладзеяў, каторыя шкодзяць у працы, але сьведамая моладзь на іх не зварочвае ўвагі і йдзе наперад. 19.I.38 г. наладжана ў нас была вечарына, у часе якое хлопцы, навучыўшыся на памяць паэму Міхася Машары „Сьмерць Кастуся Каліноўскага“, дэклямавалі яе, замяняючы тыя асобы, якія ў ёй выступаюць. Пасьля дэклямавалі вершы Машары: „На прадвесьні“, „Маладая Беларусь“ і верш Гурла „Кастусь Каліноўскі“. Вершы былі дэклямаваны з вялікім пачуцьцём і выклікалі буры воплескаў. Музыка-ж адыграла беларускі нацыянальны гімн „Не пагаснуць зоркі ў небе“. Вечар адбыўся вельмі паважна. *Б—рус.*

*Ад рэдакцыі:* Моладзь вёскі Асташын, сапраўды дужа ўмела і ўдала сарганізаваўшы 19.I.38 вышэй апісаны вечар, адсьвяткавала на сёлета прыпадаючыя 100-я ўгодкі нарадзінаў слаўнага нашага паўстанца з 1863 г. і барацьбіта за лепшую долю Беларускага Народу, К. Каліноўскага. Вечар гэты можа быць прыкладам для ўсяе беларускае моладзі. І пажадана, каб такіх вечароў было ў нас як найбольш.

Маладым культурнікам з Асташына чэсьць і слава!